Первый информант к универбу *газовка* и второй информант к универбу *двушка* представили по два значения, что свидетельствует о понимании респондентами того, что одинаково оформленный универб может иметь несколько универбантов.

Вызвало сложность толкование универбов *радужина ← радужная оболочка* и *тундрянка ← тундровая куропатка*, так как ни один из трех респондентов не представил соответствующие универбанты.

**Заключение.** Исследование и анализ данных анкетирования показал, что выполнение задания сформировало у информантов представление о процессе универбации, поспособствовало пониманию и развитию навыков осмысленного употребления универбальной лексики в процессе общения в разных ситуациях. Можно сделать вывод, о том, что явление универбации имеет значительный потенциал для формирования лексического состава языка, так как универбы различной семантики, согласно ответам респондентов, могут приобретать оттенок современности или получать такую коннотацию, которую сложно достигнуть средствами кодифицированного словаря.

УДК 821.163.3

**Н. Д. Кіган, Ж. В. Косціна**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## ВЯСКОВЫ СВЕТ У ПАЭЗІІ М. СТРАЛЬЦОВА

**Уводзіны.** Паэзія М. Стральцова — гэта асаблівы свет, у якім вясковая прастора становіцца цэнтрам глыбокіх духоўных перажыванняў і адлюстраваннем нацыянальнай самасвядомасці. У яго вершах вёска — гэта сакральная прастора, дзе лірычны герой адчувае сваю цэласнасць, знаходзіць гармонію з навакольным светам, з самім сабой. Вясковы свет пранізаны асаблівым святлом, якое сімвалізуе непарыўную сувязь чалавека з прыродай і яго каранямі. Вёска выступае не як абстрактны вобраз, а як жывая прастора, насычаная гукамі, пахамі і колерамі дзяцінства.

**Асноўная частка.** У творчасці М. Стральцова выразна прасочваецца дуалізм горада і вёскі, які прысутнічае як у яго прозе, так і ў паэзіі. Яго героі фізічна знаходзяцца ў горадзе, але адчуваюць моцную духоўную сувязь з роднаю вёскай.

Адна з цэнтральных эмоцый, што праходзіць праз паэзію пісьменніка, — гэта туга па родных мясцінах. Для лірычнага героя паэта жыццё ў горадзе — гэта пастаяннае супрацьпастаўленне вясковай прасторы.

На думку літаратурнага крытыка С. Кавалёва, «у паэзіі М. Стральцова ўрбаністычныя матывы праявіліся з асаблівай сілай і глыбінёй, набылі найбольш арыгінальнае і адметнае структурнае ўвасабленне, хаця і не запоўнілі сабой усю паэтычную творчасць пісьменніка» [1]. Гэтая напружанасць паміж горадам і вёскай ярка адлюстравана ўжо ў першым зборніку «Ядлоўцавы куст», дзе гарадскія вобразы выступаюць у супрацьпастаўленні да прыродных. Асабліва гэта заўважна ў вершы, які пачынаецца менавіта з такога параўнання: «Трамвай, як сараканожка». Трамавай і вожык — цывілізацыя і прырода. Трамвай, выключна гарадскі элемент, параўноўваецца з жывёламі: па-першае, з сараканожкай, па-другое, з вожыкам: *«Не, не падабаецца мне гэтае параўнанне, / Параўнаю трамвай лепш з вожыкам, / што цвёрда і шпарка / бяжыць па падлозе — тук! тук!»* [2, с. 24].

Пра гэтыя незвычайныя вобразы выказаўся А. Хадановіч, на думку якога «ў гэтым вершы, паэт нагадвае дзіця, якое адкрывае свет нанова, бавіцца са сваім вершам, бавіцца з гэтым светам, як з цацкай» [3].

Моцная духоўная сувязь з роднымі мясцінамі праяўляецца і ў вершы «На аўтобуснай станцыі», дзе апісваецца ад’езд сына з вёскі: *«Між станцыйнага народу / Ён з авоськай у руцэ»* [2, с. 30]. З пункту гледжання маці, якая развітваецца з сынам, што з’язджае ў горад, у вершы прысутнічаюць тыя ўнутраныя перажыванні, якія часта хвалююць стральцоўскага героя, які пакідае родныя мясціны. Гэтыя хваляванні асабліва відавочныя ў наступных радках: *«Як сабе даруе ён, / Што вязе ў абмен на сала / Мінскай выпечкі батон? / Што і лёс не так варожыць, / Што нялёгкі матчын век, / Што забраць яе не можа, / Ды і быць пры ёй не можа, — / І сумуе чалавек»* [2, с. 30]. Чалавек пакідае ў вёсцы сваю старую маці, якая частуе яго вясковымі прысмакамі, ды не можа цалкам прывыкнуць да горада — стаць гарадскім.

У зборніку «Цень ад вясла» ёсць і гэтыя вядомыя радкі: *«Вось тут, далёка ад сталіцы, / Ад ісцін новых і старых, / Жыву, як выгнаны патрыцый, / Грыбы збіраю ў бары»* [4, с. 87]. Вобраз «выгнанага патрыцыя» надае лірычнаму герою адчуванне выключанасці, адарванасці, нават чужасці гарадскому асяроддзю. Ён знаходзіць спакой далёка ад вялікага горада, у роднай вёсцы, на прыродзе, дзе можа пачувацца вольным.

Вельмі часта вясковая прастора ў паэзіі М. Стральцова набывае сімвалічнае значэнне. Дрэва — гэта не проста частка прыроды, яно сімвалізуе непарыўную сувязь з зямлёй, небам.

Сімвалам душэўнага спакою, адзінства чалавека з прыродай і гармоніі ўнутранага свету выступае вобраз дрэва ў вершы «Гэтае дрэва». Яно «разлагодзіла душу» лірычнаму герою, супакоіла: *«Хай утаймоўвае душу / Маю, о дрэва»* [2, с. 168]. Паэт не імкнецца знайсці ў ім філасофскіх глыбінь ці таямніц: *«Я не шукаю ані-ні / У ліставерці / Тваіх гадоў, тваіх планід / Сваё бяссмерце»* [2, с. 168].

Верш, які пачынаецца радкамі «Як палягчэлі ў дрэваў кроны» [2, с. 114], прасякнуты глыбокім пачуццём сувязі лірычнага героя з вёскай, прыродай, роднымі мясцінамі. У вершы выразна адчуваецца вясковы настрой: вобраз баравікоў, панізовы куст, верасы, павуцінне. «Кроны, што палягчэлі», — гэта,

Репозиторий БарГУ

магчыма, вобраз самога чалавека, які пазбаўляецца ад лішніх думак, турбот, і робіцца больш адкрытым да свету. Ён ідзе «туды палянай нацянькі», — туды, дзе былі і ёсць яго карані, дзе раслі баравікі, дзе пануе спакой. Апошнія радкі маюць вельмі важнае значэнне: *«І ніць празрыстай павуціны / не абыду, не абыду»* [2, с. 114]. Павуцінне — амаль нябачнае, але яно — як сувязь з мінулым, з вёскай, з бацькоўскай зямлёй. І аўтар не хоча абысці яе — наадварот, ён ідзе праз яе, усведамляючы сваю прыналежнасць да гэтага свету.

Верш «Роднае» з'яўляецца насычаным роздумам пра сувязь чалавека з роднай зямлёй, вёскай, мінулым і духоўным пачаткам. Аўтар праз простыя, але яркія вобразы раскрывае тэму вяртання — не толькі фізічнага, але і душэўнага, да вытокаў, да свайго «я». З першых радкоў верша ствараецца адчуванне супакаення і цёплай утульнасці: *«З двара прыйду і сяду ля агню»* [2, с. 162]. Гэта сітуацыя знаёмая кожнаму, хто хоць раз быў у вёсцы — у цішыні, сярод агню, што грэе і аб'ядноўвае. Агонь у дадзеным кантэксце — не проста побытавы элемент, а сімвал хатняга цяпла, жыцця, духоўнай гармоніі.

Важную ролю адыгрывае прырода і вясковы пейзаж. Вобраз «ссечанай капусты на градах» — прыклад таго, як штодзённая праца вяскоўца ператвараецца ў своеасаблівае блаславенне дню. Усе гэтыя дэталі — капуста, змрок, палі, срэбны лог — утвараюць гарманічны свет, дзе чалавек жыве ў еднасці з прыродай у вёсцы. Асаблівую ўвагу мае фінал верша: *«О роднае маё! / Як доўга да цябе ішоў я…»* [2, с. 162] прамаўляюцца з асаблівым душэўным надрывам. Роднае — гэта не толькі мясцовасць, а нешта глыбейшае: мова, культура, успаміны дзяцінства.

Замалёўка з жыцця беларускай вёскі прадстаўлена ў вершы «Вяртанне», якая праз штодзённыя дэталі раскрывае глыбокую сувязь чалавека з роднымі мясцінамі. Назва твора адразу паказвае на галоўны матыў — вяртанне да сваіх каранёў. Ужо ў пачатку верша гучыць прыязнае прынняцце таго, што бачыць лірычны герой: *«А нічога! Гэта можна, / Гэта можна зразумець!»* [2, с. 126]. Гэта не іранічны, а лагодны погляд чалавека, які доўга не быў у родным краі, але цяпер вярнуўся і бачыць, што ўсё засталося амаль нязменным — і гэта радуе, супакойвае. Вёска жыве сваім звыклым жыццём, дзе кожная дробязь мае сэнс: кот крадзецца па абед, стары дзед маркотна ўспамінае мінулае, брыгадзір ідзе ад фермы, а хлапчукі гуляюць у футбол галёшай.

Неабыякавы і філасофскі фінал верша: *«Свет не кепскі, а харошы — / Ліст цярушыцца на дол»* [2, с. 126]. У гэтых радках — галоўны настрой усяго твора. Гэты свет прыняты такім, які ён ёсць, са сваёй прастатой, спакоем. Ён «не кепскі», бо ў ім жыве сапраўднае — тое, што часта згублена ў гарадской мітусні.

Вобраз вады становіцца сімвалам жывой сувязі з прыродай у вершы «Такая цёплая вада». Лірычны герой стаіць у вадзе, босы, акружаны гукамі і выявамі прыроды: *«Стаю у вадзе, малы ды босы, / Між пальцы шчэміцца трава / А жабы кумкаюць»* [2, с. 13]. З цеплынёй узгадвае паэт вясковае дзяцінства, калі гукі, дотыкі, колеры прыносілі ціхую радасць, задаволеннасць штодзённым жыццём.

**Заключэнне.** Такім чынам, у паэзіі Міхася Стральцова вясковы свет — гэта прастора, дзе чалавек знаходзіць сябе, адчувае глыбокую сувязь з роднымі мясцінамі. Гарадское асяроддзе, хоць і з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця лірычнага героя, але яно не можа цалкам замяніць тое багацце прыроды і каранёў. Менавіта ў вёсцы лірычны герой адчувае спакой, гармонію і адчуванне прыналежнасці.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Кавалёў, С.* Як пакахаць ружу / С. Кавалёў. — Мінск : Асвета, 1989. — С. 44—47.
2. *Стральцоў, М.* Яшчэ і заўтра : вершы / М. Стральцоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. — 175 с.
3. *Хадановіч, А.* Топ-10 самых незвычайных вершаў беларускай літаратуры / А. Хадановіч. — URL: https://news.tut.by/culture/-175089.html (дата звароту: 19.10.2024).
4. *Стральцоў, М.* Выбраныя творы / М. Стральцоў ; уклад. і камент. М. Скоблы ; прадм. А. Сідарэвіча. — Мінск : Беларуская навука, 2015. — 652 с.

УДК 811.161.1'27:811.161.3'27

**А. С. Ковальский, Е. А. Зуева**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь*

# НАЗВАНИЯ СОБЫТИЙ ПЕРИОДА ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В РУССКОМ ЯЗЫКЕ (ОНОМАСТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ)

**Введение.** По замечанию Э. Хоффманна, «ономастический характер имен исторических событий не подвергается сомнению <…> Их употребление подчиняется узкой специфике профессиональной коммуникации в области исторических наук» [1, с. 92]. Ономастическое пространство военных событий достаточно пестрое, включающее *хрононимы* — собственные имена исторических значимых отрезков времени [2, с. 147], так как «названия мероприятий или кампаний <…> могут служить <…> своеобразными хрононимами, если известность их достаточно широка» [3, с. 200]; *документонимы* — собственные имена отдельных (важных для народа или народов) документов [2, с. 57]. Важно отметить, что «ономастические единицы, называющие военные события (войны, сражения, битвы и т. п.), не выделены в отдельный класс. В русской ономастике их принято относить к хрононимам <…> которые «должны быть выделены в отдельный класс и могут быть

Репозиторий БарГУ